Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №3(54), Ч2, 2009

*УДК 7 (476.2 – 2 Добруш): 929*

# Праславілі родны край: дзеячы мастацкай культуры – ураджэнцы Добрушчыны

А. М. Палуян

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

На нашу думку, адметнасць культурнай прасторы стварае своеасаблівую карціну свету, у якой фарміруецца духоўны строй чалавека, яго ўнутраны космас. Надзвычай важна ўжо змалку адчуваць і ўсведамляць сябе носьбітам і спадкаемцам культурнай традыцыі, якая складвалася ў той ці іншай мясцовасці на працягу стагоддзяў. А гэта стане магчымым толькі тады, калі мы будзем імкнуцца паглыбіць свае веды пра родны край.

Аб'ектам нашага даследавання сталі дзеячы мастацкай культуры Добрушскага краю і іх творчасць. Крыніцамі для збору інфармацыі паслужылі разнастайныя энцыклапедычныя даведнікі, кніга “Памяць: Добрушскі раён”, звесткі, сабраныя супрацоўнікамі Добрушскай раённай цэнтральнай бібліятэкі, перыядычныя выданні.

Добрушская зямля – малая радзіма шэрагу вядомых беларускіх мастакоў.

Член Саюза мастакоў і Саюза літаратурна-мастацкіх крытыкаў Беларусі, кандыдат мастацтвазнаўства Уладзімір Іванавіч Пракапцоў нарадзіўся 8 жніўня 1953 года ў вёсцы Жгунская Буда Добрушскага раёна. У 1975 годзе закончыў мастацка-графічны факультэт Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута па спецыяльнасці “настаўнік чарчэння, малявання і працоўнага навучання”, працаваў сакратаром Лепельскага райкома камсамола. Пасля вучобы ў аспірантуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору і паспяховай абароны кандыдацкай дысертацыі быў запрошаны на пасаду загадчыка аддзела культуры ЦК камсамола. У гады перабудовы быў мастацтвазнаўцам першай прыватнай галерэі “Медэя”, арганізоўваў выставы, вернісажы. З 1998 года – дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь.

Пад ініцыятыўным кіраўніцтвам У.І. Пракапцова ўмацоўваецца і пашыраецца матэрыяльна-тэхнічная база музея і яго філіялаў, павышаецца якасць навукова-даследчай работы супрацоўнікаў музея і іх прафесійны ўзровень. Уладзіміра Іванавіча хвалююць праблемы рэканструкцыі і экспазіцыі філіялаў Нацыянальнага мастацкага музея -- Мірскага замка, Музея беларускага народнага мастацтва ў Раўбічах, музея В. К. Бялыніцкага-Бірулі ў Магілёве, музея “Дом Ваньковічаў. Культура і мастацтва першай паловы XIX стагоддзя”. Асабістымі намаганнямі У.І. Пракапцова заключаны шматлікія пагадненні аб культурным супрацоўніцтве з вядучымі музеямі Расіі, Украіны, Літвы, Польшчы, Кітая, што сведчыць пра аўтарытэт Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь і яго актыўную міжнародную дзейнасць.

Дзякуючы асабістым сяброўскім і творчым сувязям Уладзіміра Іванавіча Пракапцова, у Беларусі былі арганізаваны выставы музея Марка Шагала (Парыж), фондаў Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі (Масква), выстава твораў Мсціслава Дабужынскага. Мінскія гледачы маглі азнаёміцца з экспазіцыяй “Тарас Шаўчэнка – мастак” і выставай іконаў з Кіева-Пячорскай лаўры (больш яны нікуды не вывозіліся).

У.І. Пракапцоў наладзіў кантакты з Беларускім экзархатам і замежнымі пасольствамі, у выніку ў Беларусі штогод адбываюцца выставы сучаснага культавага мастацтва, прыкладнога і народнага мастацтва Кітая і Японіі.

Пад асабістым кантролем Уладзіміра Іванавіча праводзіцца навукова-асветніцкая работа па прапагандзе твораў мастацтва, ажыццяўляецца супрацоўніцтва з Міністэрствам адукацыі, арганізоўваюцца разнапланавыя мастацкія выставы і акцыі. Каля 100 экспанатаў Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі ўпершыню за апошнія дзесяцігоддзі з вялікім поспехам дэманстраваліся ў Траццякоўскай галерэі.

Уладзімір Іванавіч Пракапцоў – ганаровы замежны член Расійскай акадэміі мастацтваў, член Беларускага камітэта ІКОН, член камісіі Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА. 7 сакавіка 2008 года прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін узнагародзіў У.І. Пракапцова медалём Пушкіна.

Уладзімір Іванавіч Пракапцоў выступае ў друку як мастацтвазнавец, з'яўляецца аўтарам кніг аб дзеячах мастацтва – "Нінэль Шчасная", "Мікалай Рыжанкоў", "У пошуках прыгажосці і гармоніі"; артыкулаў у перыядычным друку па праблемах манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, а таксама раздзелаў у "Гісторыі беларускага мастацтва" (у 6 тамах) – і ўдзельнічае ў рэспубліканскіх і міжнародных выставах як мастак. Ён працуе ў жанрах нацюрморта, пейзажа, тэматычнай карціны. Найбольш вядомыя палотны У.І. Пракапцова – "Апошні санет паэта", "Мроі нясвіжскага парку", "Маіх чаўноў скрыпучая туга", "В.К. Бялыніцкаму-Бірулю", "Мелодыя адыходзячай начы", "Present indefinite", "Адам Міцкевіч. Боль паэта", "Вытокі" [3, с.448]. Творчасці У.І. Пракапцова ўласціва глыбокае веданне характараў, сітуацый, фактаў, класічная яснасць і строгая завершанасць твораў.

На адной з апошніх карцін мастака – вясковы дом, атулены квітнеючым бэзам. Гэта і ёсць яго родны дом. Адсюль бярэ вытокі талент сялянскага сына і інтэлігента Уладзіміра Іванавіча Пракапцова.

Вёска Карма – радзіма вядомага беларускага мастака Акіма Міхайлавіча Шаўчэнкі. Акім Міхайлавіч вучыўся ў педагагічным тэхнікуме, працаваў настаўнікам у роднай вёсцы, браў актыўны ўдзел у ліквідацыі непісьменнасці сярод землякоў, служыў у Чырвонай Арміі. Школай павышэння прафесійнага майстэрства стала для мастака вучоба ў мастацкай студыі імя М. Урубеля ў Гомелі (1918 – 1920 гг.), Вышэйшых мастацка-тэхнічных майстэрнях у Маскве (1927 – 1930 гг.), Ленінградскім інстытуце пралетарскага выяўленчага мастацтва (1930 – 1932 гг.). Яго настаўнікамі былі С. Герасімаў, Д. Кардоўскі, А. Дрэвін, І. Машкоў, А. Архіпаў. З 1929 года А. М. Шаўчэнка актыўна ўдзельнічае ў мастацкіх выставах. У 30-ыя гады прыязджае ў Гомель. Член Беларускага саюза мастакоў з 1940 года. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны Акім Міхайлавіч удзельнічае ў выпуску газеты-плаката "Раздавім фашысцкую гадзіну". У 1956 годзе пераязджае ў Мінск, выкладае ў Мінскім мастацкім вучылішчы і Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце. Акім Міхайлавіч Шаўчэнка працаваў у розных жанрах станковага жывапісу, аўтар карцін "Плытагоны", "Збор гародніны", "На тарфяным балоце", "Уборка сена ў калгасе", "На торфараспрацоўках", "Тынкоўшчыцы", "Меліяратары", "Дрэнаж балот", "Наша песня роднаму краю", "Вячэрні Мінск", "Дзень Перамогі", "На трасе газаправода Дашкова – Мінск"; партрэтаў А. Загорскай, Т. Лапацінай, У. Карпава, А. Вераб'ёва, Н. Цярэшчанкі; нацюрмортаў "Восеньскія кветкі", "Восень. Адчыненае акно" [3, с.448-449].

Вучнямі А.М. Шаўчэнкі з'яўляюцца мастакі У.М. Рубцоў і А.І. Шароін.

Уладзімір Міхайлавіч Рубцоў нарадзіўся 26 жніўня 1936 года ў вёсцы Мар'іна Добрушскага раёна, скончыў Добрушскую сярэднюю школу і Мінскае мастацкае вучылішча, дзе атрымаў дыплом з адзнакай. Працаваў настаўнікам у школе, мастаком-афарміцелем на заводзе, з 1968 года і да выхаду на пенсію – у Бабруйскіх мастацка-творчых майстэрнях, што дазваляла займацца і асабістай творчасцю. З 1970 года ўдзельнічае ў мастацкіх выставах. Член Саюза мастакоў Беларусі з 1990 года. Зараз жыве ў Бабруйску.

Палотны У.М. Рубцова дэманстраваліся на выставах у Бабруйску, Магілёве, Мінску. Яго работы знаходзяцца ў прыватных калекцыях Расіі, ЗША, Ізраіля. Сярод асноўных твораў мастака – палотны "Гадзіннік", "Чую пана", "Мая Галгофа", "Цудоўнае імгненне", "Абуджэнне", "Прагулка", "Нічому не здзіўляцца" і інш.

Прафесію мастака Уладзімір Міхайлавіч выбраў свядома яшчэ ў 5 класе. Колькі сябе памятае, увесь час ён маляваў. Спачатку па-дзіцячы наіўна, пасля займаўся ў мастацкім гуртку пры школе. Дом бацькоў стаяў на беразе ракі, і Уладзімір заўсёды захапляўся прыгажосцю навакольных краявідаў, асабліва у час паводкі, калі прастора запоўнена вадой і толькі на гарызонце віднеецца лес. Вось і прападаў летам на рацэ, а зімой хадзіў на лыжах за 15 кіламетраў, каб намаляваць якое-небудзь асаблівае дрэва. І нават у час трохгадовай службы ў Германіі не кідаў любімы занятак.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Доўгі час У.М. Рубцоў быў прыхільнікам творчасці перадзвіжнікаў. А яго стрыечны брат, які жыў тады ў Ленінградзе і мог хоць кожны дзень бываць у Эрмітажы, пазнаёміў Уладзіміра з творчасцю імпрэсіяністаў. Пасля арміі і сам Уладзімір Міхайлавіч змяніў свае погляды, палюбіў творчасць П. Сезана, а М. Урубель і сёння з'яўляецца яго найбольш любімым рускім мастаком.

Па сцверджанню самога Уладзіміра Міхайлавіча, вялізны ўплыў на станаўленне яго як мастака зрабіў выкладчык жывапісу А. М. Шаўчэнка. На ўсё жыццё запомніліся маладому выпускніку мастацкага вучылішча словы славутага земляка: “Вы закончылі вучылішча, а цяпер трэба станавіцца мастакамі”.

І па сённяшні дзень мастак у творчым пошуку. Яго работы нялёгка паддаюцца прачытанню. Тут і гістарычныя кругавароты, філасофскія і містычныя паралелі, лікі вялікіх. На карціне У.М. Рубцова “Аўтабіяграфічны трыпціх” адна з частак мае назву “Мая радаслоўная” (маецца на ўвазе духоўная). Тут змешчана 23 партрэтныя адлюстраванні – паэты В. Іванаў, В. Брусаў, А. Белы, Г. Ахматава, М. Цвятаева, Б. Пастэрнак, А. Вазнясенскі, мастакі – Далі, Пікаса, Шагал, Босх, філосафы і літаратары – Ніцшэ, Дзюрэр, Курт Ваннегут, Эразм Ратэрдамскі, Шапенгаўэр, Дыяген, Кафка, Дастаеўскі і інш.

Аляксандр Іванавіч Шароін нарадзіўся 3 красавіка 1954 года ў вёсцы Карма Добрушскага раёна. Пасля заканчэння дзесяцігодкі застаўся лабарантам у Кармянскай сярэдняй школе. Пасля службы ў арміі, працаваў грузчыкам, упакоўшчыкам і шліфавальшчыкам на гіпсавым заводзе ў Мінску. У 1980 годзе скончыў Мінскае мастацкае вучылішча імя А.К. Глебава. Вучыўся ў мастакоў-педагогаў Ю. Выхадцава, К. Шастоўскага, В. Бароўкі, В. Лапчынскага, А. Салькова. Дыпломная работа Аляксандра Іванавіча – трыпціх “Хлеб вайны” (кіраўнік – заслужаны дзеяч мастацтваў БССР А. Малішэўскі). Аляксандр Іванавіч успамінае вучобу ў мастацкім вучылішчы як цікавы, незабыўны і непаўторны час, у які хоча зноў вярнуцца. Асабліва запомнілася летняя практыка, якую ўсе чакалі з нецярплівасцю. У час практыкі студэнты на ўсё лета выязджалі на прыроду і там стваралі свае работы, жылі ў палатках.

Вялікі ўплыў на творчасць А.І. Шароіна аказаў вядомы беларускі мастак, яго зямляк А.М. Шаўчэнка, які быў для маладога калегі і настаўнікам, і старэйшым таварышам.

Пасля заканчэння вучобы А.І. Шароін быў накіраваны настаўнікам малявання ў сярэднюю школу № 37 г. Гомеля. Але лёс распарадзіўся па-свойму: у маладога выпускніка ўкралі дакументы, калі ён ехаў уладкоўвацца на працу. Прыйшлося вярнуцца дадому, у Добруш. Многа гадоў мастак працаваў у Доме культуры імя С. Куйбышава ў Добрушы.

З 1982 года мастак бярэ актыўны ўдзел у абласных і рэспубліканскіх творчых выставах. Мае некалькі персанальных, адну замежную выставу. Найбольш плённа выступае ў жанры пейзажу – палотны “Над возерам”, “Залаты вечар”, “Лясок”, “Зялёная рунь”, “Возера Крывое”, “Жгунь. Перад навальніцай”. Піша нацюрморты. Стварыў цыкл карцін “Мой родны край”. У сваіх творах ён імкнецца адлюстраваць перш за ўсё прыроду роднага краю, а таксама прыроду тых мясцін, дзе давялося не раз пабываць, у прыватнасці – прыроду Малдовы і Украіны. Член Саюза мастакоў Беларусі з 1997 года.

Зараз А.І. Шароін працуе настаўнікам малявання ў Добрушскай гімназіі, вядзе заняткі ў студыі выяўленчага мастацтва. Работы Аляксандра Іванавіча Шароіна экспануюцца ў Добрушскім раённым краязнаўчым музеі. Летам марыць пабываць у Віцебскай вобласці, яго прываблівае край блакітных азёр. У планах і падрыхтоўка да персанальнай юбілейнай выставы, якая адбудзецца ў 2009 годзе.

У верасні 2008 года на аўкцыёне Крысці ў Лондане будуць прадстаўлены работы 20 беларускіх мастакоў, у тым ліку і Васіля Кузьміча Касцючэнкі, які нарадзіўся 25 лютага 1953 года ў вёсцы Васільеўка Добрушскага раёна.

Пісаць карціны, па словах самога мастака, падштурхнула звычайная дапытлівасць, калі ў дзяцінстве ты абвострана адчуваеш пахі і надоўга фіксуеш адчуванні -- гарачы пясок, пах агрэсту, талага снегу. У вольны час хлопчык садзіўся ля акна і разглядваў малюнкі ў падручніках ці сам маляваў. І ўжо тады, у дзяцінстве, Васілю хацелася не проста скапіраваць нейкую рэч, а перадаць тое, што ўнутры яе.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Васіль Кузьміч Касцючэнка скончыў мастацка-графічны факультэт Віцебскага педінстытута, быў вучнем Ф. Гумена і Г. Праснякова. Цяпер выкладае ў Мінскім мастацкім вучылішчы. Шырока вядомы яго палотны “Верасень”, “Цёплы вечар”, “На ўскраіне”, “Веснавы пейзаж”, “У родных мясцінах”, “Жнівень”, “Вечар”, “Лета”, “Гімн дзяцінству”, “Купалле”, “Сустрэча з мінулым”, “Дыялог”, “Вяртанне з працы”, “Маці”, “Максім Багдановіч у Ракуцёўшчыне”, “Нацюрморт”. Работы майстра знаходзяцца як у беларускіх музеях, так і ў прыватных калекцыях Расіі, Германіі, Швецыі, Італіі, Польшчы, Францыі. Член Саюза мастакоў Беларусі з 1988 года.

Пачынаў В. Касцючэнка з рэалістычнай манеры пісьма, прыходзілася пісаць “дзяжурныя” палотны. Але ж яшчэ Далі гаварыў, што той мастак мае права на эксперымент, хто авалодаў класічнай манерай пісьма. Сёння ж Васіль Кузьміч блізкі ў творчасці да фавістаў з іх плямамі інтэнсіўных, гарачых таноў, у чымсьці яго карціны напамінаюць “грубае мастацтва” з яго культам спантаннасці. Спецыялісты параўноўваюць палотны В.К. Касцючэнкі з работамі Мацiса, Брака, Дзюбуфе.

Творам В. Касцючэнкі ўласцівы індывідуальны почырк, дэкаратыўнасць, рытміка, агрэсія чырвонага і чорна-аксамітнага колераў і адначасова насычанасць нюансамі далікатных, элегантных тонаў. Важнае значэнне ў карцінах В.К. Касцючэнкі мае колер. Мастак любіць розныя колеры і выбірае іх у залежнасці ад настрою: чырвоны колер перадае адчуванне гарачыні, спякоты, белы – прахалоды. Некаторыя крытыкі называюць яго карціны “каляровымі снамі”. Але сам мастак не адносіць сваю творчую манеру да нейкага аднаго кірунку – фавізму, прымітывізму ці авангардызму. Галоўнае, што яго творы падабаюцца людзям. Мастацтва, на думку Васіля Кузьміча, павінна быць лёгкім, несці цяпло, валодаць энергетыкай.

На многіх карцінах мастака жанчына – сумная, з іканічным лікам і задумлівым поглядам. Па словах аўтара, жанчына гэта – сама прыгажосць, тайна, якую нельга разгадаць, зразумець да канца, гэтак жа, як і мастацтва. Яна робіцца ўсё больш таямнічай і няўлоўнай. А мастак павінен бачыць незвычайнае ў звычайным і перадаваць сваё бачанне на карцінах.

Самадзейны мастак Мікалай Лявонавіч Лакутка нарадзіўся ў пасёлку Чырвоны Камень Добрушскага раёна. Яшчэ ў дзяцінстве хлопец, акрамя захаплення спортам, спрабаваў маляваць. Часцей гэта былі графічныя малюнкі, у прыватнасці, партрэты бацькі, радзей – акварэлі. Неяк летам Мікалай трапіў у Ленінград і прывёз адтуль сапраўдныя алейныя фарбы і пэндзлі. Акрамя малявання, захапляўся музыкай – быў добрым гарманістам. Пасля заканчэння школы М.Л. Лакутка едзе ў Мінск, спрабуе паступіць у тэатральна-мастацкі інстытут, але конкурс быў вельмі высокі. Далей – вучоба ў Харкаўскім ваенным вучылішчы, служба наводчыкам зенітных установак у Венгрыі, паступленне на факультэт фізічнага выхавання Гомельскага педагагічнага інстытута імя В. Чкалава, праца выкладчыкам фізічнага выхавання і трэнерам па лёгкай атлетыцы ў розных навучальных установах Гомеля.

А пасля выхаду на пенсію ўспомніў Мікалай Лявонавіч пра юнацкае захапленнем маляваннем і за два гады (2004 – 2006) стварыў больш за 30 карцін, у асноўным пейзажаў. Сёння сцены кватэры самабытнага мастака нагадваюць адмысловы музей. Тут можна пабачыць шмат цікавага. Карціны М.Л. Лакуткі адлюстоўваюць прыгажосць роднага краю, добрушскай зямлі, дзе нарадзіўся і вырас гэты таленавіты чалавек. Запомніцца гледачам партрэт маці, у якім ярка перададзены вобраз жанчыны-працаўніцы. Не пакіне абыякавым і “Родны кут”, які з фатаграфічнай дакладнасцю паказвае абрысы шырокай вуліцы, кучаравыя вершаліны дрэў, простыя сялянскія хаты, традыцыйны калодзеж з вядзерцам… Лашчыць погляд “Белае возера”, што вольна раскінулася ў шырокай лагчыне, дзе нетаропка бягуць тры вузенькія рачулкі.

Творы мастака рэгулярна экспануюцца на розных выставах. У прыватнасці, у 2007 годзе карціны Мікалая Лявонавіча былі прадстаўлены ў выставачнай зале ўстановы адукацыі “Гомельскі дзяржаўны універсітэт” і ў Кузьмініцкім сельскім савеце. Плануецца арганізаваць выставу твораў М. Л. Лакуткі ў Добрушскім краязнаўчым музеі.

Не забывае Мікалай Лявонавіч і пра свае другое захапленне – музыку. Ён выдатна іграе на гармоніку, гэтак жа, як і яго дзед Васіль і бацька Лявон.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Мастак-грымёр вышэйшай катэгорыі кінастудыі “Беларусьфільм” Рыгор Рыгоравіч Храпуцкі нарадзіўся ў 1933 годзе ў Добрушы. Яшчэ ў дзяцінстве захапіўся маляваннем. Займаўся ў гуртку жывапісу пад кіраўніцтвам мастака-аматара Лук’янава Сяргея Сяргеевіча. Пазней Рыгор перайшоў у вячэрнюю школу і стаў весці гурток малявання для малодшых школьнікаў у Доме піянераў. Пад кіраўніцтвам С.С. Лук’янава Рыгор афармляў плакаты, стэнды, спектаклі для Добрушскага дома культуры. Асабліва захапляўся пейзажным жывапісам. Знаходзіў час і для занятку спортам – удзельнічаў у абласных спаборніцтвах па бегу на лыжах на 18 км.

Пасля атрымання атэстата сталасці Рыгор Рыгоравіч накіроўваецца на Украіну. Спачатку спрабуе здаць экзамены ў Львоўскае тэатральна-мастацкае вучылішча. На жаль, для паступлення не хапіла паўбала. Тады юнак адпраўляецца ў Адэсу, дзе паспяхова здае іспыты і становіцца студэнтам Адэскага тэатральна-мастацкага вучылішча. Таленавітага мастака-грымёра заўважылі на Адэскай кінастудыі і прапанавалі застацца. Але ўсё ж па размеркаванні Рыгор Рыгоравіч Храпуцкі едзе на радзіму, у Беларусь, дзе становіцца супрацоўнікам кінастудыі “Беларусьфільм”. І вось ужо пяцьдзесят гадоў не расстаецца з любімай працай.

У жыцці Р.Р. Храпуцкага было шмат сустрэч з вядомымі кінарэжысёрамі і артыстамі. Ён працаваў як мастак-грымёр на здымках фільмаў “Белыя росы” (рэжысёр І. Дабралюбаў), “Чорная бяроза” (рэжысёр В. Чацвяракоў), “Время выбрало нас” (рэжысёр М. Пташук), “Хам” (рэжысёр Дз. Зайцаў). З апошнім Рыгор Рыгоравіч здымае фільм “Стая”, прысвечаны праблемам сучаснай моладзі: малады хлопец Даніла, спакусіўшыся крымінальнай рамантыкай 90-х і лёгкімі грашыма, гіне – яго застрэлілі ў Грэцыі. Гэта не выдуманая, а рэальная трагічная гісторыя з жыцця рэжысёра Д. Зайцава. Менавіта па такім “сцэнарыі” многа гадоў таму загінуў яго сын Даніла. У ролі бацькі Данілы здымаўся вядомы расійскі акцёр Сяргей Гармаш. А грым яму падбіраў менавіта Р. Храпуцкі. Плануецца, што фільм выйдзе на экраны ў верасні 2008 года.

Са шчырай удзячнасцю ўспамінае Рыгор Рыгоравіч сваё супрацоўніцтва з выдатным беларускім кінарэжысёрам Віктарам Туравым. Менавіта ён выклікаў Храпуцкага з адпачынку і прапанаваў удзел у рабоце над фільмамі “Людзі на балоце” і “Подых навальніцы”, якія сталі унікальнай з’явай нацыянальнага кінематографу. Уклад Рыгора Рыгоравіча Храпуцкага як мастака-грымёра пры стварэнні гэтых фільмаў быў адзначаны ў 1990 годзе званнем заслужанага работніка культуры.

Р.Р. Храпуцкі з удзячнасцю ўспамінае свайго сябра, таксама ўраджэнца Добрушчыны, кінарэжысёра Калініна Мікалая Арцёмавіча, з якім разам працавалі на “Беларусьфільме”.

Сёння Рыгор Рыгоравіч Храпуцкі па-ранейшаму на любімай кінастудыі, рыхтуе добрую змену маладых мастакоў-грымёраў, карыстаецца павагай сярод калег. Вопытнага майстра цэняць за высокі прафесіяналізм, дасведчанасць, адданасць сваёй справе, патрабавальнасць, скрупулёзнасць.

З Добрушскім краем звязаны лёс спявачкі і кампазітара Алены Іванаўны Кастэнка (Лабудзевай). Яна нарадзілася 1 снежня 1948 года ў вёсцы Жгунь Добрушскага раёна ў працавітай сялянскай сям’і. Жылі ў сям’і сціпла, але не бедна, бо трымалі моцную гаспадарку. Выхоўвалася дзяўчынка пад прыглядам бабулі і дзядулі. З дзіцячых гадоў любіла спяваць, удзельнічала ў мастацкай школьнай самадзейнасці, лічылася перспектыўнай і таленавітай. Настаўнікаў музыкі ў вёсцы не было, але Алена слухала песні па радыё і імкнулася пераймаць знакамітых выканаўцаў як класічных, так і эстрадных песень. Наогул, уся сям’я Алены Іванаўны была адоранай ад прыроды – спявалі, ігралі на драўляных музычных інструментах, зробленых, дарэчы, сваімі рукамі.

Пасля заканчэння васьмі класаў мясцовай школы Алена накіравалася ў Гомель, каб паступіць у музычна-педагагічнае вучылішча. Паспяхова здала ўступныя іспыты і стала студэнткай, невыказна ўзрадаваўшы сваю маці, Настассю Іванаўну.

Яшчэ пад час іспытаў у педвучылішчы педагогі звярнулі ўвагу на музычны талент сціплай вясковай дзяўчыны і запрасілі яе наведаць Гомельскае музычнае вучылішча імя Н.Ф. Сакалоўскага. Выкладчык музычнага вучылішча, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь Аляксей Пятровіч Лукомскі змог разгледзець прыродны талент пятнаццацігадовай

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

дзяўчыны, аценіць яе непаўторны, запамінальны голас – лірычнае каларатурнае сапрана, які, дзякуючы пэўнай прафесійнай падрыхтоўцы, праявіў сябе на поўную моц. Без уступных экзаменаў Алене прапанавалі стаць студэнткай Гомельскага музычнага вучылішча імя Н.Ф. Сакалоўскага. Вось так Алена Лабудзева стала вучаніцай Івана Сцяпанавіча Працэнкі, вопытнага і мудрага педагога. Будучай вакалістцы і кампазітару прыйшлося нялёгка, але цярпенне, настойлівасць, працавітасць дапамаглі пераадолець цяжкасці. На выпускных экзаменах Алена Іванаўна выдатна выканала шэсць складаных твораў, сярод якіх – рамансы і арыя Валхвы з оперы “Садко” кампазітара Рымскага-Корсакава.

Пасля заканчэння вучобы Алене Іванаўне прапанавалі паступаць у кансерваторыю па класу фартэпіяна. Але дзяўчына была ўжо замужам (яе суджаны служыў каля Гомеля) і паехала з мужам на яго радзіму – у Семіпалацінск, што у далёкім Казахстане. Доўгі час таленавітая выпускніца вучылішча імя Н. Сакалоўскага працавала ў Казахстане выкладчыкам музычнай школы, але ўсё ж пазней сям’я зноў вярнулася на Беларусь. Спачатку Алена Іванаўна Кастэнка працавала загадчыкам сельскага клуба, а потым вяла вакальны гурток у Каранёўскай школе. З лета 2007 года – на заслужаным адпачынку. Жыве ў Гомелі разам са сваёй маці – Настассяй Іванаўнай, дапамагае дочкам гадаваць унукаў. 13-гадовая ўнучка Ганна добра спявае, і Алена Іванаўна спадзяецца, што ў будучым яна звяжа свой лёс з музыкай, працягне справу бабулі.

Жыццё Алены Іванаўны Кастэнка напоўнена музыкай і песнямі. Яна рэгулярна выступае ў сельскай школе і клубе, часты госць Добрушскай цэнтральнай бібліятэкі, супрацоўнікі якой арганізоўваюць сустрэчы, вечары рамансаў выканаўцы і кампазітара Алены Кастэнка і паэтэсы Ганны Атрошчанка з дабрушанамі. Акрамя таго, А.І. Кастэнка часта выступае ў Гомелі (ГДК, ДК “Фестывальны”, адкрытыя пляцоўкі горада), радуе гараджан і гасцей абласнога цэнтра сваім таленавітым выкананнем рамансаў, лірычных песень, эстрадных і нават дзіцячых. Да ўсяго яна піша музыку на словы таленавітых паэтаў Гомельшчыны – Галіны Рагавой, Ніны Шкляравай, Лідіі Возісавай, Валянціны Чвалавай, Дзмітрыя Нілава.

Творчасць – гэта парыў, імпульс, азарэнне… А крыніцамі мастацкай творчасці з’яўляюцца любоў да роднага краю, любоў да Айчыны. Менавіта яны натхняюць на стварэнне цудоўных твораў мастацтва, якія прыносяць гонар і славу не толькі малой радзіме, але і ўзбагачаюць скарбонку айчыннай культуры.

Сабраная інфармацыя з’яўляецца адметнай, невычарпальнай крыніцай самабытнасці і садзейнічае выхаванню ў маладога пакалення любві да роднай зямлі, абуджэнню цікавасці да яе гістарычнага мінулага, да лёсу людзей, якія нарадзіліся тут і праславілі свой край.

**Abstract.** This paper is about the lives and works of the inhabitants of Dobrush district such as workers of art, music and movie.

**Літаратура**

1 Атрошчанка, Г. Я намалюю родны кут… / Добрушскі край, № 10 ад 5 лютага 2008 года.

2 Беларуская энцыклапедыя:у 18 т. / рэдкал.: Г.П.Пашкоў (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БелЭн, 1996 – 2004.

3 Памяць: Добрушскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. У 2-х кн. Кн. 1. – Мн.: БелЭн, 1999. Кн. 2. – Мн.: БелЭн, 2001.

4 Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: у 5 т. / рэдкал. І.П.Шамякін (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БелСЭ, 1984-1987.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 16.06.08

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ